ISSN 1993-1999

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

5
2026



# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

**НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС**

**5 (322) май 2026 год**

Выдаецца са студзеня 1993 г.

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

*Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 1221 ад 8 лютага 2010 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

Адрас рэдакцыі: 220073, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 25, кабінет 408.

Тэлефон: 8 (017) 270-47-20.

Час працы: 8.30 — 17.00 (пн — пт).

http://www.aiv.by;
e-mail: bhc.redaktor2022@gmail.com, bhc@aiv.by

Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне".
220070, г. Мінск, вул. Будзённага, 21.

Тэлефон: 8 (017) 257-91-49; e-mail: aiv@aiv.by

Выхад у свет 29.05.2026 г. Афсетны друк.

Фармат 60×84 1/8.

Ум. друк. арк. 8,37. Ул.-выд. арк. 11,2.

Наклад 457 асобнікаў. Заказ № 773.

Цана свабодная.

Надрукаваны ў вытворчым даччыным унітарным прадпрыемстве "Друкарня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі".
ЛП № 38200000006490 ад 12.08.2013 г.
220030, г. Мінск, пл. Свабоды, 23-94.


Да ведама аўтараў!

За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункта гледжання аўтараў.
Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя.
Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 12 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвалу). Неабходна ў дапісах паведамляць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова ідэнтыфікацыйны нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.


**Падпісвайцеся на тэлеграм-канал выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"!**
aivbooks



**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**





**Галоўны рэдактар**
**Аляксандр Аляксандравіч КОРЗЮК,**
**кандыдат педагагічных навук, дацэнт**

**Рэдакцыйная калегія:**

**Вячаслаў Даніловіч, Дзяніс Дук, Юлія Захарына, Аляксандр Каваленя, Аляксандр Каханоўскі, Уладзімір Кошалеў, Аляксандр Кушнярэвіч, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Ігар Марзалюк, Мікалай Мязга, Аляксандр Радзькоў, Вольга Стралова (Расійская Федэрацыя), Алег Субоцін, Эдмунд Ярмусік.**

**Рэдакцыйная рада:**

**Іван Баргдановіч, Аляксандр Вабішчэвіч, Людміла Гаўрылавец, Сяргей Герасімовіч, Валянціна Гінчук, Аляксандр Гужалоўскі (старшыня), Галіна Давідоўская, Віктар Жук, Алеся Корсак, Віталь Крывуць, Вячаслаў Лазіцкі, Вадзім Лакіза, Сяргей Новікаў, Сяргей Паноў, Алена Снапкова.**

**Рэдакцыя:**

**намеснік галоўнага рэдактара — Наталля Матусевіч,**
**рэдактар аддзела — Ілля Касько,**
**вядучы тэхнічны рэдактар,**
**мастацкае афармленне — Ірына Селяменева,**
**вядучы літаратурны рэдактар — Людміла Шчэрба.**


На падставе рашэння калегіі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 04.10.2024 № 11/11 "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацый па гістарычных навуках, мастацтвазнаўстве, педагагічных навуках (агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі; тэорыя і методыка навучання гісторыі).

З лістапада 2022 г. надрукаваныя ў часопісе артыкулы размяшчаюцца ў расійскай навуковай электроннай бібліятэцы eLibrary, інтэграванай з Расійскім індэксам навуковага цытавання (РИНЦ).


**Індэксы для індывідуальнай падпіскі — 74830, для ведамаснай — 748302, на сайце belpressa.by — 679.**



© "Беларускі гістарычны часопіс", 2026.




*"Беларускі гістарычны часопіс" — лаўрэат XXII Нацыянальнага конкурсу "Залатая Літара" ў намінацыі "Лепшыя матэрыялы па тэматыцы міжканфесіянальных, міжнацыянальных адносін і міжкультурнага дыялогу". Шчыра віншуем нашых аўтараў, чытачоў і прыхільнікаў з высокай узнагародай!*

*15 мая 2026 г.*

# ЗМЕСТ

**2025—2029 гг. — ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ**


## САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Наталля Барабаш** — **Вылучэнства ў БССР у 1920—1930-х гг.: шляхі фарміравання кадравага кіраўнічага саставу** 3

## ІМЁНЫ ВЯДОМЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ

**Аляксандр Горны** — **Анастасія Сланеўская (1909—1989): невядомая постаць беларускага студэнцкага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі** 9

## УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Нина Величко** — **Демократизация и денацификация высшей школы в советской зоне оккупации Германии в 1945—1948 гг.** *(по документам Государственного архива Российской Федерации)* 15

## ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

**Людміла Гаўрылавец** — **Культурнае супрацоўніцтва ПНР з ГДР і ФРГ у 1949—1990 гг.** 20

## МЕТОДЫКА. ТЭОРЫЯ

**Вячаслаў Лазіцкі** — **Інструментарый педагагічнай дыягностыкі фарміравання гістарычнай памяці вучняў** *(пры вывучэнні факультатыва "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны")* 27

**Канстанцін Крышталь** — **Фарміраванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне сродкамі музейнай педагогікі** 33

**Андрей Гузеев** — **Просопография: новые горизонты исторического образования школьников** 35

## ЛАБІРЫНТЫ ГІСТОРЫІ

**Олег Субботин, Александр Галенок** — **Настольные игры: от появления до массового производства** *(с древнейших времён до начала XX в.)* 42

**Алена Вальчук** — **Гістарызм у беларускай літаратуры эпохі Адраджэння** 55

## МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЎРОКАЎ

**Пётр Мытнік** — **Дыдактычныя матэрыялы для арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні гісторыі Кітая ў V—VIII класах** 63

**Павел Алисиевич** — **Первая мировая война** *(задания для подготовки учащихся к олимпиаде по истории)* 66

**Галіна Жураўлёва** — **Крыжаванка "Разгортванне народнай барацьбы супраць германскіх акупантаў"** *(гісторыя Беларусі, IX клас)* 71

**Содержание/Summary** 72


*У нумары выкарыстаны фота з адкрытых крыніц.*

***Да ведама аўтараў.*** *Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, давядзенне да ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай версіі часопіса), а таксама на рэдагаванне і скарачэнне матэрыялу па меркаванні рэдакцыі. Папярэджваем аб прававой абароне аўтарскіх правоў на змешчаныя матэрыялы. Перадрук магчымы толькі з дазволу рэдакцыі з абавязковай спасылкай на "Беларускі гістарычны часопіс".*

УДК 321:94:[373+378](476)

**Вячаслаў ЛАЗІЦКІ**

*Дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*

*Сфера навуковых інтарэсаў: навукова-метадычнае суправаджэнне стварэння і сістэмнага прымянення электронных сродкаў навучання па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах; фарміраванне і развіццё інфармацыйнай кампетэнтнасці як складніка інфармацыйнай культуры асобы; прымяненне тэставых методык педагагічнай дыягностыкі і кантролю ведаў. Аўтар 4 манаграфій, 6 манаграфій у суаўтарстве, 19 дапаможнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі, 5 электронных рэсурсаў, 80 навуковых і навукова-метадычных публікацый.*



# Інструментарый педагагічнай дыягностыкі фарміравання гістарычнай памяці вучняў

## (пры вывучэнні факультатыва "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны")

**Важным метадычным аспектам крытэрыяў сфарміраванасці кампанентаў гістарычнай памяці ў сучаснай методыцы выкладання гісторыі з'яўляюцца адказы на пытанні: што выступае аб'ектам дыягностыкі? як ажыццяўляецца працэс вымярэння вызначаных паказчыкаў? з дапамогай якога інструментарыю выконваецца педагагічная дыягностыка?**

**Ключавыя словы**: *школьная гістарычная адукацыя, гістарычная памяць, інтэгратыўнасць асобы, культурна-гістарычнае асяроддзе, дыягнастычныя вымярэнні*

Педагагічная дыягностыка выніковасці фарміравання гістарычнай памяці навучэнцаў сярэдняй адукацыі павінна ўлічваць:

- распрацаваныя беларускімі гісторыкамі і педагогамі тэарэтыка-метадалагічныя і практыка-арыентаваныя палажэнні канцэпту гістарычнай памяці асобы;
- асаблівасці ўзроставага псіхафізіялагічнага развіцця навучэнцаў, а таксама механізмаў інтэграцыі падлеткаў у працэсы сацыялізацыі;
- спецыфіку складнікаў дыдактычнага і выхаваўчага патэнцыялу школьнай гістарычнай адукацыі, як і мерапрыемстваў камемаратыўнай практыкі;
- распрацаванасць інструментарыю вымярэнняў;
- абагульненне і сістэматызацыя вопыту выкарыстання інструментаў педагагічных вымярэнняў выніковасці фарміравання гістарычнай памяці асобы.

Асаблівасцю педагагічнай дыягностыкі з'яўляецца даследаванне асобы з пазіцый разумення яе працэсуальнага пераўтварэння, развіцця і ўдасканалення. *Педагагічная дыягностыка фарміравання гістарычнай памяці навучэнцаў вызначаецца намі як сістэмна арганізаваны працэс, які мае на мэце выяўленне сукупнай сфарміраванасці такіх кампанентаў, як кагнітыўны, вобразны, эмацыйна-каштоўнасны і дзейнасны, што праяўляюцца ў беражлівым і паважлівым стаўленні да гістарычнага мінулага як аснове сацыякультурнай ідэнтыфікацыі.* Спынімся на вызначаных кампанентах і іх змесце.

Сутнасцю дыягностыкі *кагнітыўнага кампанента* з'яўляецца вымярэнне якасці ведаў як аднаго са складнікаў феномена гістарычнай памяці шляхам фіксацыі наступных характарыстык:

- паўната, аб'ём, дакладнасць, трываласць;
- сістэмнасць, абагуленасць, навуковасць, фундаментальнасць;
- аператыўнасць, гнуткасць, мабільнасць;
- дзейснасць, накіраванасць на практычнае прымяненне ў сацыяльнай практыцы.

Па меркаванні доктара педагагічных навук, дацэнта С.В.Панова, працэс фарміравання гістарычнай памяці школьніка неабходна разглядаць як арганізаванае дыдактычнае канструяванне асобасна запатрабаваных і эмацыйна афарбаваных для суб'екта адукацыйнай дзейнасці ведаў і дзеянняў [1, с. 119]. У межах рэалізацыі канцэпту гістарычнай памяці выніковым паказчыкам беларускі даследчык вызначае інтэграцыю вучняў у існуючае культурна-гістарычнае асяроддзе Беларусі з фарміраваннем у іх асабістага спосабу арыентацыі ў гістарычным (сацыяльным) вопыце сучаснай беларускай нацыі.

Зыходзячы з разумення шматкампанентнага складу гістарычных ведаў важнымі з'яўляюцца:

- уяўленні і веды вучняў пра гістарычны працэс, пра заканамерныя і спецыфічныя з'явы грамадска-гістарычнага развіцця;
- веданне гістарычнай храналогіі і фактаў;
- веданне гістарычных традыцый свайго народа і дасягненняў у галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры;
- веданне гісторыі сваёй сям'і і сямейных традыцый.

Вымярэнне сфарміраванасці *вобразнага кампанента* прадугледжвае дакладнае разуменне механізмаў фарміравання ў навучэнцаў вобразаў гістарычнага мінулага наступным чынам: "слова — вобраз — дзеянне"; "вобраз — слова — дзеянне". У гістарычным вобразе ўвасабляецца ўласнае пачуццёва-эмацыйнае ўяўленне вучня пра асобаў — суб'ектаў і аб'екты гістарычнага працэсу, гістарычнае асяроддзе, гістарычныя факты ў іх каштоўнасна-ацэначным разуменні [2]. Фарміраванне гістарычнага вобраза дасягаецца шляхам паслядоўнага засваення гістарычнай інфармацыі праз шматканальнае і шматсэнсарнае ўспрыманне (візуальнае, гукавое, тактыльнае, у межах віртуальнай рэальнасці), далейшае фарміраванне ўяўленняў, якія афармляюцца ў свядомасці навучэнца ў схематызаваныя сімвальныя ці пачуццёва-эмацыйныя вобразы.

Педагагічная дыягностыка і вымярэнне сфарміраванасці *эмацыйна-каштоўнаснага кампанента* павінна абапірацца на такія асобасныя якасці навучэнцаў, як здольнасці да эмпатыі і фармулявання ўласнага стаўлення да гістарычных асоб і іх дзейнасці. У гэтым сэнсе нельга не пагадзіцца з С.В.Пановым у тым, што "*складнікамі эмацыянальна-пачуццёвага вопыту асобы з'яўляюцца тэарэтычныя, факталагічныя, ацэначныя вучэбныя гістарычныя веды, а таксама прадметныя спосабы дзейнасці, вопыт творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін да гістарычнага мінулага і яго ўдзельнікаў з улікам спецыфікі вучэбных гістарычных ведаў, якія праяўляюцца ў ходзе рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі і дыдактычна канструююцца згодна з патрабаваннямі псіхолага-педагагічнай тэорыі*" [1, с. 120].

Разуменне механізмаў вымярэння сфарміраванасці *дзейнаснага кампанента* гістарычнай памяці абапіраецца на праграмныя патрабаванні да спосабаў дзейнасці ў межах функцыянальнай пісьменнасці. Іх тэарэтыка-метадалагічная распрацаванасць айчыннымі даследчыкамі у рамках выканання ДНТП "Універсальныя кампетэнцыі" з'яўляецца каштоўным падмуркам практычнай дзейнасці настаўнікаў [3]. Сярод асобасных кампетэнцый вызначым грамадзянска-патрыятычныя, вынікам фарміравання якіх з'яўляецца валоданне гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму, разуменне сацыяльнай значнасці будучай прафесійнай дзейнасці.

З пункта гледжання методыкі дзейнасны кампанент выступае аб'ектам дыягностыкі ва ўзаемасувязі з улікам асобаснага развіцця здольнасцяў вучняў як суб'ектаў камемаратыўнай практыкі. Удзел у мерапрыемствах камемарацыі адлюстроўвае ўзаемасувязь з дзейнасным складнікам школьных гістарычных ведаў — фарміраваннем уменняў вучняў характарызаваць месцы памяці ў гістарычным часе і прасторы.

> Пад камемаратыўнай практыкай намі разумеецца рэалізацыя мерапрыемстваў, накіраваных на ўсвядомленую, мэтанакіраваную актуалізацыю гістарычных падзей (ваенныя парады; ушанаванні выбітных дзяржаўных асоб і цырымоніі ўганаравання дзяржаўнымі ўзнагародамі; святкаванні памятных гістарычных дат і юбілеяў; ушанаванне помнікаў і мемарыяльных месцаў гістарычных падзей; рытуалы ўскладання вянкоў і кветак да месцаў пахаванняў ахвяр палітыкі генацыду на беларускіх землях). Адным з прыкладаў рэалізацыі камемаратыўнай практыкі ў Рэспубліцы Беларусь на іўстытуцыянальным узроўні з'яўляецца ўсталяванне дзяржаўных свят і памятных дат у Рэспубліцы Беларусь [4].

Распрацоўка інструментарыю педагагічнай дыягностыкі сфарміраванасці гістарычнай памяці вучняў у сістэме навучання гісторыі разглядаецца намі на падставе палажэнняў Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь [5], нарматыўных патрабаванняў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адносна арганізацыі кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў [6].

Пад *інструментарыем педагагічнай дыягностыкі* намі разумеецца сукупнасць метадычных і тэхнічных сродкаў, прызначаных для фіксацыі яе вынікаў. У адпаведнасці з патрабаваннямі 10-бальнай сістэмы ацэньвання [6, с. 219—229] да сродкаў дыягностыкі сфарміраванасці гістарычнай памяці навучэнцаў неабходна аднесці наступныя:

- дыдактычныя матэрыялы бягучага этапнага і выніковага кантролю ў вучэбных дапаможніках (напрыклад, па вучэбных прадметах "Гісторыя Беларусі ў кантэксце ўсеагульнай гісторыі", "Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны");
- зборнікі вучэбных заданняў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (напрыклад, зборнікі сітуацыйных задач па вучэбных прадметах "Гісторыя Беларусі", "Усеагульная гісторыя");
- інфармацыйныя электронныя рэсурсы адукацыйнай платформы MOODLE (напрыклад, кантрольна-дыягнастычныя модулі электронных вучэбна-метадычных комплексаў па вучэбных прадметах "Гісторыя Беларусі ў кантэксце ўсеагульнай гісторыі", "Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны") [2; 7], а таксама пры вывучэнні факультатыву "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны".

Адпаведнасць шматкампанентнай інтэгратыўнай структуры гістарычнай памяці і аб'ектаў дыягностыкі і інструментарыю вымярэння прадставім у табліцы 1.

*Табліца 1*

**Педагагічная дыягностыка вынікаў фарміравання ў навучэнцаў гістарычнай памяці**

| *Кампаненты* | *Аб'ект дыягностыкі і педагагічнага вымярэння* | *Інструментарый вымярэння адпаведна шкале ацэньвання* |
|---|---|---|
| Кагнітыўны | Засвоенасць шматкампанентнага складу ведаў па гісторыі згодна са змястоўнымі лініямі гістарычнай адукацыі; веданне гісторыі ўласнай сям'і і малой Радзімы. | Рознаўзроўневая 10-бальная сістэма ацэньвання згодна з нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў і паказчыкамі шкал ацэньвання [6, с. 219—229]. |
| Вобразны | Сфарміраванасць і дзейснасць механізмаў стварэння вобразаў гістарычнага мінулага праз алгарытмізацыю прадстаўлення і засваення зместу вучэбнага матэрыялу ў паслядоўнасцях: "слова — вобраз — дзеянне"; "вобраз — слова — дзеянне". | |
| Эмацыйна-каштоўнасны | Сфарміраванасць здольнасці да эмпатыі і фармулявання ўласнага стаўлення да гістарычных падзей і асоб, іх дзейнасці. | |
| Дзейнасны | Засвоенасць спосабаў вучэбнай дзейнасці з улікам спецыфікі навучання гісторыі; удзел у мерапрыемствах камемаратыўнай практыкі. | |

Практычны накірунак педагагічнай дыягностыкі і вымярэння сфарміраванасці кампанентных якасцяў гістарычнай памяці асобы вучня магчыма вызначыць на падставе некаторых заданняў (*гл. табліцу 2*). Яны падрыхтаваныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм і зместам навучання па прадмеце "Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі", факультатыве "Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны".

*Табліца 2*

**Рознаўзроўневыя заданні для педагагічнай дыягностыкі сфарміраванасці гістарычнай памяці вучняў XI класа**

*(выніковы кантроль па тэме "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксца Другой сусветнай вайны")*

**Варыянт 1**

| *№* | *Кампанент вымярэння* | *Заданне / тлумачэнне* | *Бал* |
|---|---|---|---|
| 1 | Кагнітыўны | По азначэнні назавіце тэрмін.<br>Ужыванне сілы адной дзяржавай супраць іншай з мэтай захопу яе тэрыторыі, ліквідацыі незалежнасці, змены палітычнага і грамадскага ладу — гэта … .<br>Адказ: *агрэсія*.<br>Дыягнастуецца засвоенасць вучнямі аднаго з элементаў гістарычнай тэрміналогіі і ўменне рэпрадуцыраваць веды на практыцы праз выкананне задання тэставага характару (адкрытая форма задання). | 1 |
| 2 | Кагнітыўны | Правільна суаднясіце назвы ваенна-стратэгічных аперацый ваеннага камандавання Чырвонай арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і іх сутнасць. Улічыце, што кожнаму элементу належыць адзін правільны элемент.<br>1) "Багратыён"; 2) "іскра"; 3) "Кальцо"; 4) "Кутузаў".<br>А) контрнаступленне Чырвонай арміі пад Масквой; Б) ліквідацыя блакады Ленінграда; В) наступальная аперацыя Чырвонай Арміі ў ходзе бітвы пад Курскам; Г) поўнае вызваленне тэрыторыі Беларусі; Д) разгром нямецка-фашысцкіх войск пад Сталінградам.<br>Адказ: *1Г; 2Б; 3Д; 4В*.<br>Дыягнастуецца засвоенасць вучнямі гістарычных фактаў і ўменне рэпрадуцыраваць веды на практыцы праз выкананне задання тэставага характару (закрытая форма задання). | 1 |
| 3 | Вобразны | Уважліва прачытайце і вызначыце паняцце (паняцці), якое (якія) аб'ядноўваюць тэрміны і назвы: абарона Брэсцкай крэпасці, абарона Магілёва, партызанскі рух, патрыятычнае падполле, "рэйкавая вайна", "страляючы горад".<br>Адказ: *патрыятызм, гераізм*.<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў аб'ядноўваць пералічаныя тэрміны і назвы адпаведным паняццем. | 1 |
| 4 | Вобразны | Вызначыце паняцце, якое аб'ядноўвае тэрміны і назвы: "Балотная ліхаманка", Вялікі і Малы Трасцянец, гета, Дальва, "Я з вогненнай вёскі", план "Ост", Халакост, Хатынь.<br>Правільны адказ: *генацыд, палітыка генацыду*.<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў аб'ядноўваць пералічаныя тэрміны і назвы агульным паняццем. | 1 |
| 5 | Эмацыйна-каштоўнасны | Вызначыце тэрміны і назвы, якія можна аднесці да каштоўнасцяў: а) Беларуская цэнтральная рада; б) Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; в) Закон Рэспублікі Беларусь "Аб генацыдзе беларускага народа"; г) калабарацыя; д) Манумент Перамогі ў Мінску; е) мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць – герой"; ж) остарбайтэры; з) удзел беларусаў у агульнаеўрапейскім руху Супраціўлення; і) Халакост.<br>Адказ: *б; в; д; е; з*.<br>Дыягнастуецца наяўнасць пачуццёва-эмацыйнага (эмпатыйнага) уяўлення вучняў пра гістарычнае мінулае, здольнасці да эмпатыі і фармулявання ўласнага стаўлення да гістарычных падзей. | 1 |

*Працяг табліцы 2, варыянт 1*

| № | Кампанент вымярэння | Заданне / тлумачэнне | Бал |
|---|---|---|---|
| 6 | Эмацыйна-каштоўнасны | Згодна з указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у нашай краіне ўсталяваны дзяржаўныя святы і памятныя даты. Вызначыце тыя даты, што маюць дачыненне да ўшанавання гістарычных падзей перыяду Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў у якасці лёсавызначальных для беларускага народа: а) 15 сакавіка; б) 2 красавіка; в) 9 мая; г) 22 чэрвеня; д) 3 ліпеня; е) 17 верасня; ж) 23 лютага.<br>Адказ: *в; г; д; е.*<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў рэпрадуцыраваць веды пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце Другой сусветнай вайны праз пачуццёва-эмацыйнае ўяўленне і практычнае выкананне задання тэставага характару (закрытая форма задання з выбарам некалькіх правільных варыянтаў адказу). | 1 |
| 7 | Дзейнасны | Вызначыце назвы вуліц вашага населенага пункта, дадзеныя ім у памяць пра герояў Вялікай Айчыннай вайны ці звязаныя з яе падзеямі.<br>Вызначыце мемарыяльныя помнікі, месцы ў вашым населеным пункце, звязаныя з гераічнымі і трагічнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны.<br>Прывядзіце прыклады асабістага ўдзелу у мерапрыемствах па ўшанаванні памяці пра гераічныя і трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны.<br>*Дапускаецца варыятыўны адказ на веданне гісторыі малой Радзімы.*<br>Заданне варыятыўнага характару. Дыягнастуецца ўменне вучняў актуалізаваць веды пра Вялікую Айчынную вайну ў кантэксце ўласнага асэнсавання мемарыялізацыі і ўдзелу ў мерапрыемствах камемаратыўнай практыкі. | 1 |
| 8 | Дзейнасны | Вызначыце ў храналагічнай паслядоўнасці абласныя цэнтры БССР па датах пачатку іх акупацыі захопнікамі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Улічыце колькасны склад абласных цэнтраў БССР згодна з тагачасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам.<br>А) Баранавічы; Б) Беласток; В) Брэст; Г) Віцебск; Д) Гомель; Е) Гродна; Ж) Магілёў; З) Мазыр; І) Мінск; К) Пінск.<br>Адказ: *В) Брэст — 22 чэрвеня; Е) Гродна — 23 чэрвеня; А) Баранавічы і Б) Беласток — 27 чэрвеня; І) Мінск — 28 чэрвеня; К) Пінск — 4 ліпеня; Г) Віцебск — 11 ліпеня; Д) Гомель — 19 жніўня; З) Мазыр — 22 жніўня.*<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў пабудаваць паслядоўнасць гістарычных падзей пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. На падставе засвоенасці навучэнцамі гістарычных фактаў і храналогіі будуецца паслядоўнасць захопу ворагам абласных цэнтраў БССР. Адным са складнікаў правільнага выканання задання з'яўляецца трывалае веданне вучнямі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу рэспублікі на пачатак вайны. | 1 |
| 9 | Дзейнасны | Правільна суаднясіце элементы мностваў, якія адлюстроўваюць сувязь прычын і вынікаў гістарычных падзей і працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Улічыце, што кожнаму элементу належыць толькі адзін элемент выбару.<br>1) ідэі сусветнага панавання і барацьбы за жыццёвыя прасторы для нацыстаў; 2) імклівае наступленне германскіх войскаў; 3) разгортванне партызанскага руху; 4) расавая тэорыя нацызму.<br>А) агрэсія; Б) генацыд; В) калабарацыя; Г) "маланкавая вайна"; Д) "рэйкавая вайна".<br>Адказ: *1А; 2Г; 3Д; 4Б.*<br>Дыягнастуецца ўменне вучня вызначыць прычынна-выніковыя сувязі паміж элементамі двух мностваў — прычынамі і вынікамі гістарычных з'яў, працэсаў (закрытая форма задання). | 1 |
| 10 | Дзейнасны | Вызначыце значнасць і дзейнасць наступных асоб.<br>1) арганізацыя органаў кіравання партызанскім рухам — ЦШПР і БШПР;<br>2) кіраўніцтва вайсковымі злучэннямі, якія вызвалялі тэрыторыю Беларусі ад акупантаў;<br>3) кіраўніцтва патрыятычным падполлем на акупаванай тэрыторыі Беларусі;<br>4) першыя Героі Савецкага Саюза — партызаны Беларусі.<br><br>Адказ: *4. На фота: Ц.П.Бумажкоў і Ф.І.Паўлоўскі — першымі з беларускіх партызан у жніўні 1941 г. узнагароджаныя ганаровым званнем Героя Савецкага Саюза.*<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў разам з візуалізацыяй гістарычных персаналій вызначаць іх характарыстыку (закрытая форма задання з выбарам аднаго вернага варыянта). | 1 |
| | | **Агульны вынік** | **10** |

**Варыянт 2**

| № | Кампанент вымярэння | Заданне / тлумачэнне | Бал |
|---|---|---|---|
| 1 | Кагнітыўны | Па азначэнні назавіце тэрмін.<br>Свядомае, добраахвотнае і наўмыснае супрацоўніцтва з ворагам у яго інтарэсах і на шкоду сваёй дзяржаве — гэта … .<br>Адказ: *калабарацыянізм*.<br>Дыягнастуецца засвоенасць вучнямі аднаго з элементаў гістарычнай тэрміналогіі і ўменне рэпрадуцыраваць веды на практыцы праз выкананне задання тэставага характару (адкрытая форма задання). | 1 |
| 2 | Кагнітыўны | Правільна суаднясіце назвы ваенна-стратэгічных аперацый ваеннага камандавання Германіі ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах з азначэннем іх зместу. Улічыце, што кожнаму элементу належыць толькі адзін элемент выбару.<br>1) “Белы”; А) ваенные дзеянні супраць Польшчы;<br>2) “Герынг”; Б) наступальная аперацыя пад Сталінградам;<br>3) “Тайфун”; В) наступальная аперацыя ў перыяд бітвы пад Курскам;<br>4) “Цытадэль”. Г) план наступлення на Маскву;<br>Д) стварэнне правакацыйнай прычыны для нападу на Польшчу.<br>Адказ: *1А; 2Д; 3Г; 4В*.<br>Дыягнастуецца засвоенасць вучнямі гістарычных фактаў і ўменне рэпрадуцыраваць веды на практыцы праз выкананне задання тэставага характару (закрытая форма задання) | 1 |
| 3 | Вобразны | Уважіва прачытайце і вызначыце паняцце (паняцці), якое (якія) аб’ядноўваюць тэрміны, назвы і імёны: аперацыя “Канцэрт”, БШПР, Ц.П.Бумажкоў і Ф.І.Паўлоўскі, В.З.Корж, “рэйкавая вайна”, формы патрыятычнага супраціўлення акупантам, ЦШПР.<br>Адказ: *партызанскі рух*.<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў аб’ядноўваць пералічаныя тэрміны і назвы агульным паняццем. | 1 |
| 4 | Вобразны | Вызначыце паняцце, якое аб’ядноўвае тэрміны і назвы: гета, масавыя забойствы яўрэяў, мемарыял “Яма”, расавая тэорыя нацыстаў.<br>Адказ: *Халакост*.<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў аб’ядноўваць пералічаныя тэрміны і назвы агульным паняццем. | 1 |
| 5 | Эмацыйна-каштоўнасны | Вызначыце тэрміны і назвы, якія можна аднесці да каштоўнасцяў: а) агульнаеўрапейскі рух Супраціўлення і ўдзел у ім беларусаў; б) антыгітлераўская кааліцыя; в) Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; г) генацыд; д) гераічная абарона Брэсцкай крэпасці; е) ідэалогія фашызму; ж) калабаранты; з) прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь “Аб генацыдзе беларускага народа”; і) утварэнне ЦШПР і БШПР.<br>Адказ: *а; б; в; д; з; і*.<br>Дыягнастуецца наяўнасць пачуццёва-эмацыйнага (эмпатыйнага) уяўлення вучняў пра гістарычнае мінулае, здольнасці да эмпатыі і фармулявання ўласнага стаўлення да гістарычных падзей. | 1 |
| 6 | Эмацыйна-каштоўнасны | Згодна з указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у нашай краіне ўсталяваны дзяржаўныя святы і памятныя даты. Вызначыце тыя даты, што маюць дачыненне да ўшанавання гістарычных падзей перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў якасці лёсавызначальных для беларускага народа: а) 15 сакавіка; б) 2 красавіка; в) 9 мая; г) 22 чэрвеня; д) 3 ліпеня; е) 17 верасня.<br>Адказ: *в; г; д*.<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў рэпрадуцыраваць веды пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце Другой сусветнай вайны праз пачуццёва-эмацыйнае ўяўленне і практычнае выкананне задання тэставага характару (закрытая форма задання з выбарам некалькіх правільных варыянтаў адказу). | 1 |
| 7 | Дзейнасны | Вызначыце назвы вуліц вашага населенага пункта, дадзеныя ім у памяць пра герояў Вялікай Айчыннай вайны ці звязаныя з яе падзеямі.<br>Вызначыце мемарыяльныя помнікі, месцы ў вашым населеным пункце, звязаныя з гераічнымі і трагічнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны.<br>Прывядзіце прыклады асабістага ўдзелу ў мерапрыемствах па ўшанаванні памяці пра гераічныя і трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны.<br>*Дапускаецца варыятыўны адказ на веданне гісторыі малой Радзімы.*<br>Заданне варыятыўнага характару. Дыягнастуецца ўменне вучняў актуалізаваць веды пра Вялікую Айчынную вайну ў кантэксце ўласнага асэнсавання мемарыялізацыі і ўдзелу ў мерапрыемствах камемаратыўнай практыкі. | 1 |
| 8 | Дзейнасны | Вызначыце ў храналагічнай паслядоўнасці назвы абласных цэнтраў БССР па датах іх вызвалення ад акупацыі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Улічыце колькасны склад абласных цэнтраў БССР згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам, які існаваў у рэспубліцы.<br>А) Баранавічы; Б) Беласток; В) Брэст; Г) Віцебск; Д) Гомель; Е) Гродна; Ж) Магілёў; З) Мазыр; І) Мінск; К) Пінск.<br>Адказ: *Д) Гомель — 26 лістапада 1943 г.; З) Мазыр — 14 студзеня 1944 г.; А) Баранавічы — 8 чэрвеня 1944 г.; Г) Віцебск — 26 чэрвеня 1944 г.; І) Мінск — 3 ліпеня 1944 г.; К) Пінск — 14 ліпеня 1944 г.; Е) Гродна — 16 ліпеня 1944 г.; Б) Беласток — 27 ліпеня 1944 г.; В) Брэст — 28 жніўня 1944 г.*<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў пабудаваць паслядоўнасць гістарычных падзей заключнага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. На падставе засвоенасці навучэнцамі гістарычных фактаў і храналогіі будуецца паслядоўнасць вызвалення ад захопнікаў абласных цэнтраў БССР. Адным са складнікаў правільнага выканання задання з’яўляецца трывалае веданне вучнямі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу рэспублікі на пачатак вайны. | 1 |

*Працяг табліцы 2, варыянт 2*

| № | Кампанент вымярэння | Заданне / тлумачэнне | Бал |
|---|---|---|---|
| 9 | Дзейнасны | Правільна суаднясіце элементы мностваў, якія адлюстроўваюць сувязь прычын і вынікаў гістарычных падзей і працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Улічыце, што кожнаму элементу належыць толькі адзін элемент выбару.<br>1) барацьба патрыятычнага падполля ў Мінску; А) “дзіўная вайна” ў Еўропе;<br>2) пачатковы перыяд Другой сусветнай вайны; Б) дзяржаўная палітыка;<br>3) прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь “Аб генацыдзе беларускага народа”; В) “новы парадак”;<br>Г) “рэйкавая вайна”;<br>4) поўная акупацыя тэрыторыі Беларусі. Д) “страляючы горад”. | 1 |
| | | Адказ: *1Д; 2А; 3Б; 4В.*<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў вызначаць прычынна-выніковыя сувязі паміж элементамі двух мностваў — прычынамі і вынікамі гістарычных з’яў, працэсаў (закрытая форма задання) | |
| 10 | Дзейнасны | Вызначыце гістарычную дзейнасць наступных асоб.<br>1) арганізацыя органаў кіравання партызанскім рухам — ЦШПР і БШПР;<br>2) дзейнасць патрыятычнага падполля ў Мінску;<br>3) кіраўніцтва вайсковымі злучэннямі, якія вызвалялі тэрыторыю Беларусі ад акупантаў;<br>4) першыя Героі Савецкага Саюза — партызаны Беларусі.  | 1 |
| | | Адказ: *1. На фота: П.К.Панамарэнка — кіраўнік ЦШПР; П.З.Калінін — кіраўнік БШПР.*<br>Дыягнастуецца ўменне вучняў разам з візуалізацыяй гістарычных персаналій вызначаць іх характарыстыку (закрытая форма задання з выбарам аднаго правільнага варыянта). | |
| | | **Агульны вынік** | **10** |

Структура і змест заданняў, іх тыпалогія суадносныя са шматкампанентным складам гістарычнай памяці як інтэграванай якасці асобы вучня. Комплекс заданняў у табліцы 2 будуецца наступным чынам: кампанент педагагічнай дыягностыкі і вымярэння; заданне; адказы і абгрунтаванае дыдактычнае тлумачэнне алгарытму дзейнасці; бал за адказ.

У якасці высноў вызначым наступныя арганізацыйна-педагагічныя ўмовы эфектыўнага прымянення інструментарыю педагагічнай дыягностыкі фарміравання гістарычнай памяці навучэнцаў:

- развіццё навуковай рэфлексіі па распрацоўцы дыдактычнай мадэлі методыкі фарміравання гістарычнай памяці асобы навучэнцаў у сістэме школьнай гістарычнай адукацыі;
- улік функцыянальных характарыстык сродкаў дыягностыкі (вымяральнасць і рэгіструемасць вынікаў; магчымасць верыфікацыі вынікаў і інфармаванасць суб’ектаў педагагічнага ўзаемадзеяння; дэтэрмінавальны ўплыў на развіццё працэсаў унутранай матывацыі, а таксама і кіраўніцкіх рашэнняў у арганізацыі і ажыццяўленні працэсу фарміравання гістарычнай памяці асобы);
- зместавая варыятыўнасць заданняў і іх адаптаванасць да працэсу вымярэння сфарміраванасці шматкампанентнай інтэграванай структуры гістарычнай памяці вучня);
- інтэграванасць у методыку навучання гісторыі з улікам прынцыпу пераемнасці.

1. Паноў, С. В. Канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь / С. В. Паноў. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023. — 272 с.

2. Давідоўская, Г. Э. Фарміраванне вобразных уяўленняў у вучняў 8—9 класаў пры вывучэнні гісторыі Беларусі : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. Э. Давідоўская ; пад. рэд. С. В. Панова. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2022. — 176 с.

3. Формирование универсальных компетенций обучающихся в контексте ведущих тенденций развития образования / О. В. Зеленко, В. Ф. Русецкий, В. Г. Стуканов, А. В. Торхова [и др.] // Веснік адукацыі. — 2025. — № 2. — С. 6—11.

4. Государственные праздники Беларуси / Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — URL : https://pravo.by/gosudarstvo-i-pravo/gosudarstvennye-prazdniki (дата обращения: 15.02.2026).

5. Концепция школьного исторического образования в Республике Беларусь. Одобрена постановлением Министерства образования Республики Беларусь 08.11.2022 № 13.2 // Гісторыя і грамадазнаўства. — 2024. — № 2. — С. 6—14.

6. Методические указания по организации контроля и оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, применению норм оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам : утв. зам. Министра образования Респ. Беларусь А. В. Кадлубаем 15.09.2022 : в ред. от 30.08.2024 // Национальный образовательный портал. — URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess/obshchee-srednee-obrazovanie/metodicheskie-rekomendatsii-ukazaniya.html (дата обращения: 15.02.2026).

7. Кришталь, К. Н. Дидактический потенциал средств формирования исторической памяти о Великой Отечественной войне у учащихся IX—XI классов / К. Н. Кришталь // Беларускі гістарычны часопіс. — 2025. — № 1. — С. 39—43.

*Паступіў у рэдакцыю 10.03.2026.*